# Да 110-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна

## ПА ЛЕНІНСКАМУ ШЛЯХУ

Імя Уладзіміра Ільіча Леніна стала сімвалам нашай эпохі. Справа яго стала справай мільёнаў людзей, якія змагаюцца за светлую будучыню чалавецтва. Шлях, вызначаны Леніным, асветлены пражэктарам яго неўміручых ідэй, стаў шляхам пабудовы камунізму.

Тытан навуковай думкі, Ленін усебакова развіў рэвалюцыйнае вучэнне Маркса і Энгельса, адкрыў новы этап марксізму. «Ленінізм — гэта марксізм сучаснай эпохі, адзінае, цэласнае вучэнне міжнароднага рабочага класа, якое няспынна развіваецца» (Пастанова ЦК КПСС аб 110-й гадавіне з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна). Ідэйная спадчына Леніна, рэвалюцыйны дух ленінізму служыць невычэрпнай крыніцай рэвалюцыйнай думкі і дзеяння савецкага народа, міжнароднага камуністычнага руху. Створаная Леніным партыя новага тыпу, у якой увасоблена непарыўнае адзінства навуковай тэорыі і практыкі, вядзе наш народ па Ленінскаму шляху пад сцягам рэвалюцыйнай барацьбы, камуністычнага будаўніцтва і міру.

Цесна згуртаваны вакол партыі, савецкі народ пабудаваў новае грамадства развітога сацыялізму. Паспяхова праводзіцца ў жыццё праграма эканамічнага будаўніцтва, стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму, удасканалення грамадскіх адносін, выхавання савецкіх людзей у духу камуністычнай ідэйнасці. Вынікам ажыццяўлення Ленінскай нацыянальнай палітыкі нашай партыі стала развіццё нашай шматнацыянальнай савецкай дзяржавы, згуртаванне больш чым ста нацый і народнасцей краіны ў новую гістарычную супольнасць — савецкі народ, які высока нясе сцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму. Ва ўсёй сваёй рабоце партыя апіраецца на магутны навуковы патэнцыял Краіны Саветаў, пастаянна клапоціцца аб росце адукацыі народа, духоўнага багацця нашага грамадства, аб прымнажэнні каштоўнасцей шматнацыянальнай савецкай культуры, якая развіваецца па ленінскаму прынцыпу партыйнасці.

Развіццё нашай рэспублікі — яркі ўзор дасягненняў Ленінскай палітыкі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Ажыццяўляючы Ленінскія запаветы, працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыіператварылі свой край з адсталага і беднага кутка Расійскай імперыі ў квітнеючую індустрыяльна-аграрную, багатую і культурную сацыялістычную дзяржаву. Беларуская ССР, адна з роўных рэспублік Савецкай Радзімы, справядліва ганарыцца поспехамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Магутныя МАЗы і надзейныя трактары, мінскія гадзіннікі і электронныя вылічальныя машыны, нашы «Гарызонты» і «Акіяны» вядомы ў самых розных кутках зямлі. Беларускую бульбу ведаюць і далёка па-за межамі нашай рэспублікі. Традыцыйны лён у спалучэнні з сучасным лаўсанам любяць модніцы паўсюдна. У зорным небе некалькі сот разоў акружылі нашу Зямлю касмічныя караблі, камандзірамі якіх былі ўраджэнцы нашай рэспублікі. Электрычныя цягнікі ўжо курсіруюць на многіх магістралях Беларусі, а неўзабаве яны будуць хадзіць праз усю рэспубліку. На падводных крылах імчацца па беларускіх рэках хуткаходныя «ракеты». У Мінску будуецца метро... Калі б усё гэта сказаць яшчэ ў той час, калі жыў Ле-

нін, многія б не паверылі. Пасля сустрэчы з Леніным вялікі англійскі фантаст Герберт Уэлс назваў яго крамлёўскім летуценнікам. Фантазіі не хапіла выдатнаму фантасту, каб паверыць у бальшавіцкую мару пра лепшую будучыню, каб зразумець самае галоўнае ў гэтай мары — рэальнасць яе ажыццяўлення. «Слова Леніна не забудзецца, — гавораць у Беларусі, — што сказаў ён, тое збудзецца». Беларускі народ разам з усімі народамі нашай Айчыны добра разумее, што ключ поспехаў яго — у непарыўнай дружбе народаў Савецкага Саюза, у мудрым кіраўніцтве Камуністычнай партыі, у закладзеных Леніным асновах пабудовы нашага грамадства.

Выдатных поспехаў дасягнула беларуская культура. Слова Янкі Купалы і Якуба Коласа ўвайшло ў скарбніцу сусветнай літаратуры як слова выдатных сыноў беларускага народа. Далёка за межамі рэспублікі сталі вядомымі творы многіх лепшых беларускіх пісьменнікаў — нашых сучаснікаў. Харавая капэла Рыгора Шырмы і дыскі з запісамі «Песняроў», выступленні беларускіх гімнастак і перамогі нашых фехтавальшчыкаў, карціны М. Савіцкага і манументы Ю. Градава, В. Занковіча, Л. Левіна, С. Селіханава даносяць да людзей усёй планеты здабыткі культуры вольнага беларускага народа, які ў час Вялікай Айчыннай вайны разам з усімі народамі Савецкага Саюза адстаяў сваю свабоду, заваяваную Вялікім Кастрычнікам. Нядаўна беларуская навука адзначыла пяцідзесяцігоддзе сваёй Акадэміі, якая за выдатныя поспехі ўзнагароджана ордэнам Леніна. Беларусь па праву ганарыцца дасягненнямі сваёй вышэйшай школы. Ленінскі прынцып дэмакратызму вышэйшай адукацыі адкрыў шлях у інстытуты і універсітэты тысячам і тысячам дзяцей рабочых і сялян. У краі, дзе да рэвалюцыі па сутнасці не было вышэйшых навучальных устаноў, цяпер функцыянуе 31 ВНУ, у тым ліку ўжо тры універсітэты. У іх навучаецца звыш 170 тысяч студэнтаў, якія атрымліваюць больш чым дзвесце спецыяльнасцей.

Заснаваны па Ленінскаму дэкрэту Беларускі дзяржаўны універсітэт, з якога пачыналася навука і вышэйшая асвета ў рэспубліцы, які стаў флагманам беларускай вышэйшай школы, носіць імя вялікага Правадыра. Наш універсітэт сумленнай працай па выхаванню будучых спецыялістаў, па падрыхтоўцы іх гатовымі для вырашэння ўсіх тых задач, якія стаяць перад краінай, сваім укладам у распрацоўку фундаментальных і прыкладных навуковых праблем, сваёй сувяззю з працоўнымі заводаў і ніў, з творчай інтэлігенцыяй, з сваімі выпускнікамі імкнецца апраўдаць тое вялікае імя, якое яму прысвоіў урад.

Сустракаючы 110-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, вучоныя БДУ узялі на сябе павышаныя абавязацельствы. Калектыў універсітэта ў выніку сацыялістычнага спаборніцтва дасягнуў значных поспехаў у навуковай і вучэбнай дзейнасці. Так, толькі супрацоўнікі філалагічнага факультэта за 1979 год апублікавалі 213 навуковых прац агульным аб'ёмам каля чатырохсот пяцідзесяці друкаваных аркушаў. Сярод гэтых прац — першы том падручніка па сучаснай рускай мове, падрыхтаванага пад кіраўніцтвам П. П. Шубы, падручнікі і дапаможнікі па беларускай вуснай паэтычнай творчасці, старажытнарускай літаратуры, літаратуры еўрапейскіх сацыялістычных краін, беларускай дыялекталогіі, у падрыхтоўцы якіх прынялі ўдзел М. Р. Ларчанка, Е. С. Мяцельская, Е. М. Камароўскі, Л. Л. Кароткая, Л. М. Гусева, В. М. Цімафеева, «Паэтычны слоўнік» В. П. Рагойшы і другі выпуск «Частотнага слоўніка беларускай мовы» Н. С. Мажэйка і А. Я. Супруна, манаграфіі Ф. І. Куляшова, В. П. Рагойшы, І. П. Кахно, Б. А. Плотнікава, Н. В. Галаўко, К. Р. Хромчанкі, Д. Я. Бугаёва; Н. С. Гілевіч надрукаваў чацвёрты том сабраных пад яго кіраўніцтвам і падрыхтаваных ім сучасных запісаў беларускага фальклору; П. П. Шуба прыняў удзел у падрыхтоўцы чарговага тома беларускага тлумачальнага слоўніка; апублікаваны перавыданні школьных падручнікаў супрацоўнікаў факультэта, надрукаваны падрыхтаваныя на факультэце 5 праграм для універсітэтаў. М. А. Паўленка і Л. А. Бурак абаранілі доктарскія дысертацыі, а некалькі былых аспірантаў абаранілі свае кандыдацкія работы. У Сафіі адбыўся Другі сімпозіум па балгарска-беларускіх моўных сувязях, на якім прагучала сем дакладаў дэлегацыі нашага універсітэта. Гэтаму сімпозіуму прысвечаны спецыяльны нумар часопіса «Съпоставително езикознание». Філолагі БДУ выступілі і на іншых адказных навуковых форумах міжнароднага і агульнасаюзнага значэння, у тым ліку на навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Руская мова — мова дружбы і супрацоўніцтва народаў СССР», на IV кангрэсе, арганізаваным у Берліне, Міжнароднай асацыяцыяй выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры (МАПРЯЛ). Лекцыі вучоных-

філолагаў БДУ слухалі ў мінулым годзе не толькі нашы студэнты, але і студэнты іншых ВНУ краіны, а таксама Югаславіі, Балгарыі, ГДР. Тут названы некаторыя вынікі навуковай працы толькі філалагічнага факультэта. Аналагічных поспехаў дабіліся таксама вучоныя іншых факультэтаў БДУ, у тым ліку факультэту журналістыкі, а таксама агульнаўніверсітэцкіх кафедраў, сярод якіх выкладчыкі замежных моў, рускай мовы, педагогікі і псіхалогіі. Сваю працу яны прысвячаюць росквіту культуры роднага народа, яго камуністычнаму выхаванню, далейшаму ўздыму яго матэрыяльнага і духоўнага жыцця.

Разам з тым, абапіраючыся на ленінскі ўзор прынцыповага і крытычнага стаўлення да недахопаў, мы добра разумеем, што яшчэ далёка не вычарпаны рэзервы паляпшэння арганізацыі і правядзення навуковай работы, а асабліва работы па навучанню і выхаванню студэнцтва. Змест некаторых курсаў, у тым ліку прафіліруючых, не заўсёды адказвае патрэбам сённяшняга дня. Узровень лекцый і асабліва ўзровень практычных і лабараторных заняткаў нярэдка зводзіцца да працы па запамінанню дробных фактаў замест усваення навуковых абагульненняў і метадаў аналізу. Творчы падыход да кіравання працэсам авалодання ведамі і ўсебаковага выхавання студэнтаў часам замяняецца паперамі і «птушкамі» ў спісах мерапрыемстваў, асобныя выкладчыкі не заўсёды з поўнай адказнасцю адносяцца да выканання сваіх асноўных абавязкаў, фактычна хаваюцца за спінамі тых, хто забяспечвае вялікія сумарныя паказчыкі. Узровень асобных навуковых прац, нават тых, якія атрымліваюць станоўчую ацэнку кафедраў, не заўсёды адпавядае сучаснаму стану навуковых даследванняў.

Кіруючыся Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў», а таксама матэрыяламі Пленума ЦК КПБ «Аб дзейнасці партыйных арганізацый навуковых і вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі па павышэнню ўзроўню даследчай работы, накіраванай на паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы», усебакова ўлічваючы ў сваёй працы партыйныя дакументы па пытаннях культуры, адукацыі, навукі, увесь калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, а ў прыватнасці філолагі і журналісты, псіхолагі і педагогі прыкладуць усе свае намаганні да далейшага паляпшэння якасці ўсіх аспектаў нашай работы, да павышэння эфектыўнасці навуковай, вучэбнай і выхаваўчай работы. Да гэтага нас абавязвае ўжо зробленае і дасягнутае. Да гэтага нас абавязвае веліч задач, якія стаяць перад нашай партыяй, перад нашай краінай. Да гэтага нас абавязвае вялікае імя Леніна, які ўказаў савецкаму народу слаўны шлях у камунізм.

Г. В. БУЛАЦКИЙ, В. Г. БУЛАЦКИЙ

## В. И. ЛЕНИН — РЕДАКТОР

Учение В. И. Ленина о печати, его редакторский и публицистический опыт — величайшая школа воспитания кадров средств массовой информации и пропаганды не только стран социализма, но и всей подлинно революционной и демократической прессы. Вот почему к ленинским трудам, его богатейшему опыту журналиста обращаются как теоретики публицистики, так и практические работники газет, журналов, издательств, радио и телевидения. За последнее время вышел в свет целый ряд крупных работ о редакторской и публицистической деятельности В. И. Ленина. Однако в исследовании этой области еще много «белых пятен».

По образованию юрист, В. И. Ленин на вопросы ряда анкет о профессии отвечал: «редактор», «литератор», «писатель», «сотрудник газет»... Обращаясь к Ленину как редактору, мы прежде всего должны иметь в виду методы его работы, принципы, которыми он руководствовался при редактировании и формировании облика газеты или журнала, его участие во всех процессах издания и распространения партийных органов, борьбу за действенность выступлений, заботу о массовости и оперативности, его взгляды на роль и место редактора в деятельности редакции и т. д.

В. И. Ленин был принципиальным редактором. Он и мысли не допускал, чтобы на страницах руководимого им печатного органа могли появиться оппортунистические, антимарксистские статьи, что снижало бы идейную направленность, марксистскую выдержанность газеты или жур-